Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных установ
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
____________________А.І.Жук
"___"______________2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____/тып.

# КАМП'ЮТЭРНАЯ АРАНЖЫРОЎКА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных установ**
**па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці 1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады**
**(камп'ютэрная музыка)**

**УЗГОДНЕНА**

Начальнік упраўлення навучальных
устаноў і кадраў Міністэрства
культуры Рэспублікі Беларусь
________________ Н.Ю.Шмакава
"___" ________________ 2010 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб'яднання вышэйшых навучальных
устаноў Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне культуры
і мастацтваў
________________ Б.У.Святлоў
"___" ________________ 2010 г.

**УЗГОДНЕНА**

Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ Ю.І.Міксюк
"___" ________________ 2010 г.

Рэктар
дзяржаўнай установы адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы"
_______________ М.І. Дзямчук
"___" ________________ 2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
________________ ________________
"___" ________________ 2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Складальнік***

*А.М.Елісеенкаў*, дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

кафедра мастацкай творчасці і прадзюсерства прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”;

*Э.Б.Зарыцкі*, намеснік старшыні Беларускага саюза кампазітараў Рэспублікі Беларусь, кампазітар, народны артыст Беларусі

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 8 ад 10.04.2008 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 25.11.2008 г.);

навукова-метадычным саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў
(пратакол № 4 ад 16.02.2009 г.)

Адказны за рэдакцыю В.М. Сакалова
Адказны за выпуск А.М. Елісеенкаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Камп’ютэрная аранжыроўка” з’яўляецца адной з базавых дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці “мастацтва эстрады” напрамку “камп’ютэрная музыка”. “Камп’ютэрная аранжыроўка” накіравана на фарміраванне ў студэнтаў практычных навыкаў па аранжыроўцы музычных твораў з выкарыстаннем сучасных камп’ютэрных тэхналогій. Дысцыпліна прадугледжвае авалоданне навыкамі работы з VST-(віртуальнымі) інструментамі, сінтэзаванымі і акустычнымі гукамі.

“Камп’ютэрная аранжыроўка” цесна звязана з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як “Асновы кампазіцыі”, “Спецінструмент (камп’ютэр)”, “Поліфанія”, “Аналіз музычных формаў”, “Інструментоўка”, “Аранжыроўка і пераклад музычных твораў”, “Фартэпіяна”, “Аркестравы клас” і інш.

Выкладанне дысцыпліны “Камп’ютэрная аранжыроўка” грунтуецца на непарыўнай сувязі тэорыі з практыкай.

*Асноўнай мэтай курса* з’яўляецца падрыхтоўка кваліфікаваных спецыялістаў, здольных аранжыраваць музычныя творы, ствараць арыгінальныя творчыя працы з выкарыстаннем навейшых камп’ютэрных тэхналогій.

У межах курса прадугледжана *выкананне наступных задач*:

– пашыраць веды аб магчымасцях VST-інструментаў;

– выкарыстоўваць асноўныя прынцыпы аранжыроўкі музычных твораў з ужываннем VST-інструментаў;

– авалодваць прынцыпамі стварэння Riffs, Loops у розных стылях і кірунках акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

– засвойваць прынцыпы стварэння MIDI-праектаў;

– набываць навыкі камп’ютэрнай аранжыроўкі музычных твораў розных жанраў.

У выніку вывучэння дысцыпліны выпускнік павінен ***ведаць:***

- прынцыпы стварэннння мідзі-праекта;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- прынцыпы арганізацыі саунд-меню;
- рытмовыя і стылістычныя асаблівасці блюза, рок-н-рола, балады, эр-н-бі, дыска,лаціна-амерыканскіх рытмаў;
- прынцыпы арганізацыі гарманічнай вертыкалі ў мідзі-праекце;
- асноўныя аркестравыя лініі (педаль, рытмавая пульсацыя, кантрапункт);
- прынцыпы арганізацыі музычнай формы праекта;
- прынцыпы спалучэння акустычных і віртуальных інструментаў.

***Умець:***

- ствараць мідзі-праекты;
- арганізоўваць саунд-меню;
- выкарыстоўваць рытмовыя і стылістычныя асаблівасці блюза, рок-н-рола, балады, эр-н-бі, дыска, лаціна-амерыканскіх рытмаў;
- арганізоўваць гарманічную вертыкаль у мідзі-праекце;
- выкарыстоўваць асноўныя аркестравыя лініі (педаль, рытмовая пульсацыя, кантрапункт);
- будаваць музычную форму праекта;
- спалучаць акустычныя і віртуальныя інструменты;
- выкарыстоўваць магчымасці VST-інструментаў;
- ажыццяўляць мастэрынг музычных фанаграм.

Аб’ём ведаў па дысцыпліне “Камп’ютэрная аранжыроўка” абумоўлены вучэбнай праграмай і разлічаны на пяцігадовае навучанне. Агульная колькасць гадзін складае 670, з якіх 304 адводзіцца на аўдыторныя заняткі (індывідуальныя). Веды і практычныя навыкі студэнтаў рэкамендавана кантраляваць ў працэсе навучання (залікі, экзамены), а таксама пры арганізацыі пазааўдыторнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | | індывідуальныя заняткі |
| 1. | Уводзіны ў прадмет | 2 |
| 2. | Асаблівасці творчага працэсу пры рабоце над камп’ютэрнай аранжыроўкай | 12 |
| 3. | Рытм-група | 8 |
| 4. | Loops – паняцце, правілы стварэння, разнавіднасці | 8 |
| 5. | Kicks – правілы стварэння, разнавіднасці, фарміраванне рытму | 4 |
| 6. | Snares, claps, snaps, их разнавіднасці, правілы фарміравання рытму | 4 |
| 7. | Hi-hats, cymbals, tom-toms, іх разнавіднасці, правілы фарміравання рытму | 4 |
| 8. | Percussion, іх разнавіднасці, правілы фарміравання рытму | 4 |
| 9. | Elastic, Electro, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 4 |
| 10. | Hybrid perc., Noise FX, Turntable FX, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 4 |
| 11. | Retro Hits, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 4 |
| 12. | Бас-разнавіднасці VST-інструментаў | 4 |
| 13. | Правілы стварэння ліній баса | 4 |
| 14. | Аранжыроўка баса | 8 |
| 15. | Нетыповыя мелодыка-гарманічныя формы баса (“хады”). | 8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| 16. | “Сярэдзіна” рыфа – паняцце, правілы стварэння музычных ліній | 8 |
| 17. | VST – Guitars, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 18. | VST – Keyboards, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 19. | VST – Sequences, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 4 |
| 20. | Pads, E.FX, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 21. | Lead, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання | 4 |
| 22. | Riffs – паняцце, правілы іх стварэння | 6 |
| 23. | Riffs у стылях Jazz, Blues | 8 |
| 24. | Riffs у стылях Rock, Rockabilly, Progressive Rock | 8 |
| 25. | Riffs у стылях Reggae, Boogie | 8 |
| 26. | Riffs у стылю Funk | 8 |
| 27. | Riffs у стылях Dance, Fusion | 8 |
| 28. | VST-струнна-смычковыя інструменты | 8 |
| 29. | VST-драўляныя духавыя інструменты | 8 |
| 30. | VST-медныя духавыя інструменты, іх рзнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 31. | VST-ударныя інструменты сімфанічнага аркестра, іх рзнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 32. | VST-этнічныя музычныя інструменты, іх рзнавіднасці, правілы выкарыстання | 8 |
| 33. | VSTі, якія імітуюць гучанне чалавечага голасу, вакальнага ансамбля, хору | 4 |
| 34. | Музычная форма аранжыроўкі | 8 |
| 35. | Аранжыроўка на аснове аўдыёматэрыялу | 16 |
| 36. | Аранжыроўка на аснове нотнага матэрыялу | 16 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| 37. | Аранжыроўка песні | 12 |
| 38. | Аранжыроўка твора малой формы | 12 |
| 39. | Аранжыроўка твора буйной формы | 12 |
| 40. | Прымяненне гукавых эфектаў | 8 |
| 41. | Мікшыраванне фанаграмы | 4 |
| 42. | Мастэрынг фанаграмы | 4 |
| | Усяго... | 304 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### *Тэма 1.* Уводзіны ў прадмет

Паняцце “камп’ютэрная аранжыроўка”. Аранжыроўка як від творчай дзейнасці. Адрозненне камп’ютэрнай аранжыроўкі ад традыцыйнай акустычнай.

### *Тэма 2.* Асаблівасці творчага працэсу пры рабоце над камп’ютэрнай аранжыроўкай

Камп’ютэрная аранжыроўка: стварэнне, запіс, звядзенне музычных трэкаў. Узаемадзеянне аранжыроўшчыка з выканаўцам, гукарэжысёрам, прадзюсерам, музыкантамі. Уплыў абсталявання на канчатковы вынік.

### *Тэма 3.* Рытм-група

Інструменты рытм-групы. Ударная ўстаноўка, гітара, бас-гітара, клавішныя, перкусія.

### *Тэма 4.* Loops – паняцце, правілы стварэння, разнавіднасці

Аб’яднанне ліній *Kicks, Snare, Hi-hats, Percussion*. Аднатактавыя, двухтактавыя і чатырохтактавыя *Loops*. *Loops* з выкарыстаннем FX.

### *Тэма 5.* Kicks – правілы стварэння, разнавіднасці, фарміраванне рытму

Разнавіднасці *Kicks, Club, Electronic, Old school, Urban, Vinyl.* Лінія *Kicks* з выкарыстаннем простых рытмаў. Лінія *Kicks* з выкарыстаннем сінкапіраваных рытмаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6.* Snares, claps, snaps, іх разнавіднасці, правілы фарміравання рытму

Разнавіднасці *Snares: Aggressive, Bright, Drum mashines, Electronic, Lite, Old school, Urban, Vinyl. Claps* and *Snaps.* Узаемадзеянне *Snares, Claps, Snaps* з *Kicks. Break* з выкарыстаннем *Snares, Claps, Snaps.*

### *Тэма 7.* Hi-hats, cymbals, tom-toms, іх разнавіднасці, правілы фарміравання рытму

Віды *VSTi-Hi-hats: Bright, Chunky, Edgy, Electronic. VSTi-cymbals*: *Crashes, Rides, Tom-toms.* Узаемадзеянне *Hi-hats* з *Kicks, Snares,* "збіўкі" *(Breack)* па *Tom-toms, Snares, Cymbals, Kicks.*

### *Тэма 8.* Percussion, іх разнавіднасці, правілы фарміравання рытму

Віды *Percussion: Bongos, Congas, Djembes, Shakers* and *Cabasas, Tambourines, Cowbells, Timbales, Triangles, Windchimes.* Узаемадзеянне розных *VSTi-percussion*, узаемадзеянне з асноўным *Loops.*

### *Тэма 9.* Elastic, Electro, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання

Разнавіднасці *VSTi-Elastic: Dance, Short Benders.* Разнавіднасці *VSTi-Electro: Electronic percussion, Synthetics play ground, Vacode Chords, Wierdness, Zone Tones.* Стылістычныя асаблівасці і правілы *Elastic, Electro.*

### *Тэма 10.* Hybrids perc., Noise FX, Turntable FX, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання

Разнавіднасці *Hybrids perc.: Metal Menagerie, Metallic Hits, Wood From Far Far Away.* Разнавіднасці *Noise FX: Filtered Noise, Radio Waves, Sweepers. Turntable FX.* Стылістычныя асаблівасці і правілы выкарыстання *Hybrids perc., Noise FX, Turntable FX.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 11.* Retro Hits, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

Разнавіднасці *Retro Hits: Big Band Electro Hits, Big Band Vintage Hits.* Стылістычныя асаблівасці і правілы выкарыстання *Retro Hits.*

***Тэма 12.* Бас-разнавіднасці VST-інструментаў**

VSTi імітуючыя натуральны гук бас-гітары: *Broomstick bass (Acoustic, Electric, Keyboard, Pedal), Korg M1, Colossus, Virtual Bassist, Trilogy.*

***Тэма 13.* Правілы стварэння ліній баса**

Узаемадзеянне лініі баса з тэмай. Узаемадзеянне баса з *Loops.* Увязванне лініі баса і лініі *Kick.*

***Тэма 14.* Аранжыроўка баса**

Значэнне тэмбра баса. Выкарыстанне акордавых нот. Выкарыстанне неакордавых (дыатанічных, храматычных). Гамападобны рух лініі баса. Меладызаваная лінія баса. Выкарыстанне прыёмаў ігры на бас-гітары і іх імітацыя ў камп’ютэрнай аранжыроўцы.

***Тэма 15.* Нетыповыя мелодыка-гарманічныя формы баса (“хады”)**

*3/4 Jazz Waltz, 3/4 Bluesy Waltz, 5/4 Five-step, 6/4 Cool jazz, 6/4Lullaby, 6/4 Slippery, 6/4 Happy Feet, 7/4 Fusion.*

***Тэма 16.* “Сярэдзіна” рыфа – паняцце, правілы стварэння музычных ліній**

“Сярэдзіна” як састаўная частка  рыфа. “Сярэдзіна” як аркестравая лінія. Педаль (меладычная, гарманічная). Рытмічная пульсацыя (меладычная, гарманічная). Кантрапункт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 17.*** **VST – Guitars, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

*Virtual Acoustic Guitar, Virtual Electric Guitar, Virtual Guitarist Electric Edition, Real Guitar, Colossus, Hypersonic.* Правілы выкарыстання віртуальнай фактуры. Правілы стварэння арыгінальнай гітарнай лініі.

***Тэма 18.*** **VST – Keyboards, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

*Keyboards: Piano, E.Piano, Organs, Korg M1, Hypersonic, Reactor.* Правілы выкарыстання *Keyboard.*

***Тэма 19.*** **VST – Sequences, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

Асаблівасці *Sequences.* Правілы выкарыстання *Sequences.* Узаемадзеянне *Sequences* з асноўнай тэмай. Роля *Sequences* у музычнай форме.

***Тэма 20.*** **Pads, E.FX, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

Разнавіднасці *Pads: Soft, Bright, Moving, Airy, Flutey, Glassy.* Правілы выкарыстання *Pads.* Разнавіднасці *E.(Electro) FX: Atmospheres, Scenes, Unreal, Sub Drones, Urban, Natural, Musical.*

***Тэма 21.*** **Lead, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання**

Разнавіднасці *Lead: Soft Leads, Hard Leads.* Правілы выкарыстання *Lead. Lead* у правядзенні асноўнай тэмы. *Lead* у правядзенні кантрапункта.

***Тэма 22.*** **Riffs – паняцце, правілы іх стварэння**

*Riffs* як стылістычная метрарытмічная формула. Састаўныя часткі *Riffs: Loop, Bass,* “сярэдзіна”. Правілы стварэння *Riffs.* Аднатактавыя, двухтактавыя, чатырохтактавыя *Riffs. Riffs* і музычная форма твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 23.* **Riffs у стылях Jazz, Blues**

*Riffs* у стылі *Jazz: Monkey, Pedal work, Free Form, Organic Swing. Riffs* у стылі *Blues: Minor Blues, Sweet16, Uptempo, Backbeat, LA Blues.*

### *Тэма 24.* **Riffs у стылях Rock, Rockabilly, Progressive Rock**

*Riffs* у стылі *Rock: Experience, Bassment, Glamour, Activity, Overtime, Roxy, Power Ballad. Riffs* у стылі *Rockabilly: Hi Rockabilly, Stready Bass, Bassic Slap. Riffs* у стылі *Progr. Rock: Octave Ryder, Walking.*

### *Тэма 25.* **Riffs у стылях Reggae, Boogie**

*Riffs* у стылі *Reggae: Low Down, Skank, Mobile, Sunshine, Funky, Agile. Riffs* у стылі *Boogie: Raw, Chuk, Bo Diddley Beat.*

### *Тэма 26.* **Riffs у стылю Funk**

Асноўныя *Riffs* у стылі *Funk: Essentials, Happy, Slappy, Strolling, Solid, Jax Special, Slappy Funky, Street Smart, Funkster, Ballad slap, Laid Back slap, Deep Funky.*

### *Тэма 27.* **Riffs у стылях Dance, Fusion**

*Riffs* у стылі *Dance: Disco, Aggression, Call Me Mad, 70's Dim Bouncer. Riffs* у стылі *Fusion: Blindfolded, Rush Hour, Hysteria.*

### *Тэма 28.* **VST-струнна-смычковыя інструменты**

Разнавіднасці струнна-смычковых VSTі*: Edirol Orchestral, Symphonic Orchestra Strings, Colossus.* Правілы выкарыстання струнна-смычковых VSTі. Сольныя, групавыя і аркестравыя лініі струнна-смычковых VSTі. Выкарыстанне VST-струнна-смычковых інструментаў у аранжыроўцы тэмы і ліній акампанементу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 29.* VST-драўляныя духавыя інструменты

Разнавіднасці драўляных духавых VSTi*: Edirol Orchestral, Symphonic Orchestra, Symphonic Orchestra Woodwinds, Colossus.* Правілы выкарыстання драўляных духавых VSTi. Сольныя, групавыя і аркестравыя лініі драўляных духавых VSTi. Выкарыстанне VST-драўляных духавых інструментаў у аранжыроўцы тэмы і акампанементу.

### *Тэма 30.* VST-медныя духавыя інструменты, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання

Разнавіднасці медных духавых VSTi: *Edirol Orchestral, Symphonic Orchestra Bass, Colossus*. Правілы выкарыстання медных духавых VSTi. Сольныя, групавыя і аркестравыя лініі медных духавых VSTi. Выкарыстанне VST-медных духавых інструментаў у аранжыроўцы тэмы і ліній акампанементу.

### *Тэма 31.* VST-ударныя інструменты сімфанічнага аркестра, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання

Разнавіднасці VST-ударных інструментаў сімфанічнага аркестра: *Edirol Orchestral, Symphonic Orchestra Percussion, Colossus.*

### *Тэма 32.* VST-этнічныя музычныя інструменты, іх разнавіднасці, правілы выкарыстання

Разнавіднасці этнічных VSTi: *Ethnosphere, Etnik Melodic virtual instrument, Hypersonic.* Правілы выкарыстання этнічных VSTi. Сольныя і групавыя лініі этнічных музычных VSTi. Выкарыстанне VST-этнічных музычных інструментаў у аранжыроўцы тэмы і ліній акампанементу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 33.* VSTi, якія імітуюць гучанне чалавечага голасу, вакальнага ансамбля, хору

Разнавіднасці VSTi, якія імітуюць гучанне чалавечага голасу, хору – *Colossus, Hyper Canvas, Hypersonic.* Правілы выкарыстання VSTi голасу, вакальнага ансамбля, хору. Сольныя і групавыя лініі VSTi голасу, вакальнага ансамбля, хору. Выкарыстанне VSTi голасу, вакальнага ансамбля, хору ў аранжыроўцы тэмы і ліній акампанементу.

### *Тэма 34.* Музычная форма аранжыроўкі

Найбольш выкарыстоўваемыя музычныя формы. Уступ, імправізацыя, кода. Асноўныя прыёмы іх напісання. Куплетная, двухчасткавая, трохчасткавая формы. Балада, ронда, сюіта, папуры.

### *Тэма 35.* Аранжыроўка на аснове аўдыёматэрыялу

Аналіз аудыёматэрыялу. Вызначэнне тэмпу, формы, *Riff, Loop.* Тэмбравая драматургія аранжыроўкі.

### *Тэма 36*. Аранжыроўка на аснове нотнага матэрыялу

Вызначэнне стылю аранжыроўкі. Стварэнне *Riffs.* Стварэнне формы, асноўных гарызантальных ліній аранжыроўкі.

### *Тэма 37*. Аранжыроўка песні

Вызначэнне стылю аранжыроўкі. План аранжыроўкі. Стварэнне рэгістравага і тэмбравага “калідора” для голасу ў фактуры аранжыроўкі.

### *Тэма 38.* Аранжыроўка твора малой формы

Вызначэнне стылю аранжыроўкі. План аранжыроўкі. Рэгістравая і тэмбравая драматургія тэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 39.* Аранжыроўка твора буйной формы

Вызначэнне стылю аранжыроўкі. Рэгістравая і тэмбравая драматургія тэмы і асноўных аркестравых ліній (педаль, рытмічная пульсацыя, кантрапункт).

### *Тэма 40.* Прымяненне гукавых эфектаў

Гукавыя эфекты платформы *Direct X*. Гукавыя эфекты платформы *VST*, *DXI*. Гукавыя эфекты праграм *Cubase SX 3, Nuendo 3*.

### *Тэма 41.* Мікшыраванне фанаграмы

Прынцыпы панараміравання інструментаў. Гукавы баланс асноўных музычных ліній. Папярэдняя эквалізацыя і кампрэсаванне музычных трэкаў.

### *Тэма 42.* Мастэрынг фанаграмы

Асноўныя гукавыя эфекты, якія ўжываюцца пры мастэрынгу. Кампрэсаванне, эквалізацыя музычных трэкаў. Пашырэнне стэрэабазы музычных трэкаў. Аптымізацыя агульнага гучання аранжыроўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Петелин, Р.* Аранжировка музыки на PC / Р. Петелин, Ю. Петелин. – СПб.: BHV, 2001. – 272 с.
2. *Петелин, Р.* Персональный оркестр в PC. / Р. Петелин, Ю. Петелин. – СПб.: BHV, 1999. – 251 с.
3. *Белунцов, В.* Новейший самоучитель работы на компьютере для музыкантов / В. Белунцов.– СПб.: ТехБук, 2001. – 560 с.
4. *Пучков, С.В.* Музыкальные компьютерные технологии. Современный инструментарий творчества / С.В. Пучков, М.Г.Светлов. –СПб.: ГУП, 2005. – 232 с.
5. *Браун, Р.* Компьютер-композитор. Искусство создания танцевальной музыки на компьютере с примерами на CUBASE / Р. Браун. – М.: ЭКОМ, 1998. – 448 с.
6. *Гаранян, Г.А.* Аранжировка для эстрадных и вокально-инструментальных ансамблей / Г.А. Гаранян. – М.: Музыка, 1986. – 224 с.
7. *Дегтярев, И.А.* Cakewalk SONAR. Студия звукозаписи в системе Microsoft Windows XP / И.А. Дегтярев. – М.: Майор, 2002. – 496 с.
8. *Живайкин, П.* 600 звуковых и музыкальных программ DHV / П. Живайкин. – СПб.: BHV, 1999. – 624 с.
9. *Кунин, Э.* Секреты ритмики в джазе, рок- и поп-музыке / Э. Кунин. – М.: Синкопа, 2001. – 56 с.
10. *Петелин, Р.* Аранжировка музыки на PC / Р. Петелин, Ю. Петелин. – СПб.: BHV, 2001. – 272 с.
11. *Хэрли, Д.* Джаз-рок. Аранжировка для клавишных инструментов / Д. Хэрли. – М.: ГИД, 2002. – 56 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*


1. *Чулаки, М.И.* Инструменты симфонического оркестра / М.И. Чулаки. – М.: Музыка, 1983. – 172с.
2. *Браславский, Д.А.* Аранжировка для эстрадных ансамблей и оркестров / Д.А. Браславский. – М.: Музыка, 1974. – 392 с.
3. *Дмитриев, Г. П.* Ударные инструменты: трактовка и современное состояние / Г.П. Дмитриев. – М.: Сов. композитор, 1991. – 136 с.
4. *Киянов, Б.П.* Руководство по инструментовке для эстрадных оркестров и ансамблей / Б.П. Киянов, С.И. Воскресенский. – Л.: Музыка, 1978. – 182 с.
5. *Козлов, А.* Рок. Истоки и развитие / А. Козлов. – М.: Синкопа, 2001. – 192 с.
6. *Кузнецов, В.Г.* Работа с самодеятельными эстрадными оркестрами и ансамблями / В.Г.Кузнецов. – М.: Музыка, 1986. – 150 с.
7. *Левандо, П.П.* Хоровая фактура / П.П. Левандо. – Л.: Музыка, 1984. – 124 с.
8. *Оленников, К.В.* Аранжировка / К.В. Олеников. – Ростов н/Д: Феникс, 2003. – 112 с.
9. *Пистон, У.* Оркестровка / У. Пистон; пер. с англ. – М.: Сов. композитор, 1990. – 459 с.
10. *Порвенков, В.Г.* Акустика и настройка музыкальных инструментов / В.Г. Порвенков. – М.: Музыка, 1990. – 191 с.
11. *Симоненко, В.С.* Лексикон джаза / В.С. Симоненко. – Киев: Муз. Украина, 1981. – 112 с.
12. *Симоненко, В.С.* Мелодии джаза / В.С. Симоненко. – Киев: Муз. Украина, 1984. – 318 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Афіцыйныя дакументы, якія рэгулююць вучэбны працэс*

1. *О высшем* образованнии: закон Респ. Беларусь, 11 июля 2007 г., № 252-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2007. – № 171. – С. 4 – 18.
2. *О внесении* изменений и дополнений в некоторые постановления Совета Министров Республики Беларусь: постановление Сов. Мин. Респ. Беларусь, 5 авг. 2005 г., № 872 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2005. – № 125. – С. 20 – 24.
3. *ОСРБ* 1-17 03 01-2008. Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь: спецыяльнасць 1-17 03 01-01 “мастацтва эстрады” (па напрамках). Зацверджаны і ўведзены ў дзеянне загадам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 07.08.2008 г., № 64.

Інтэрнет-рэсурсы

1. www.electroshock.ru – сайт Ассоциации электроакустической музыки России.
2. www.csounds.com/ – официальный сайт программы Csound. Содержит самую подробную информацию о программе и обо всем, что с ней связано.
3. http://www.csounds.com/manual/html/index.html – справочное руководство по программе Csound.
4. www.soundonsound.com/ –“Sound On Sound” один из лучших интернет-журналов, посвященных звукозаписи.
5. http://www.soundonsound.com/information/Glossary.php – глоссарий журнала “Sound On Sound”.
6. http://www.harmony-central.com/ – “Harmony Central.com” – ведущий интернет-ресурс для музыкантов, предоставляющий ценную информацию от новостей и обзоров музыкальной продукции до классифицированных по темам рекламных объявлений и чатов.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. http://www.625-net.ru/arch.htm – электронный архив журнала “Звукорежиссер”, предназначенного для специалистов в области звуковых технологий.
8. http://www.websound.ru – интернет-журнал, посвященный компьютерному звуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбнае выданне

**КАМП'ЮТЭРНАЯ АРАНЖЫРОЎКА**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці**
**17 03 01 мастацтва эстрады**
**напрамку 17 03 01 – 02 камп'ютэрная музыка**

*Рэдактар В.М.Сакалова*
*Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая*


Падпісана ў друк 2009 г. Фармат 60х84 $^1/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. .
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ